# КНІГА СЛАВЫ ШЧУЧЫНСКАГА РАЁНА

<table>
<tr><td>

**АНДРЭЕЎ Анатоль Яўгенавіч**

Нарадзіўся 1 верасня 1916 г. у горадзе Рагачове.
Былы камандзір партызанскага атрада імя Камсамола Беларусі. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Айчыннай вайны І ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, Крыжам Грунвальда ІІІ класа, медалямі. Герой Сацыялістычнай працы.
Удастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за актыўны ўдзел у партызанскім руху на тэрыторыі Шчучынскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
</td><td></td></tr>
<tr><td>

**АНТАНОВІЧ Славамір Валяр'янавіч**

Нарадзіўся 9 студзеня 1955 года ў вёсцы Пілеўсі Шчучынскага раёна.
Беларускі дзяржаўны і грамадскі дзеяч, пісьменнік, журналіст. Аўтар 15 кніг і каля 300 публікацый у СМІ. Лаўрэат прэміі Саюза журналістаў Беларусі «Залатое пяро» і рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Залаты купідон». Мае ганаровае званне «Заслужаны журналіст» (2010). Член праўлення Беларускага Фонду міру.
</td><td></td></tr>
<tr><td>

**БЯЛЯЎСКАЯ Галіна Прохараўна**

Нарадзілася 26 мая 1954 года ў вёсцы Азярцо Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці.
Педагог, мастак, паэтка. Лаўрэат прэміі імя А.І. Дубко Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва».
</td><td></td></tr>
<tr><td>

**БЕЛЯКОЎ Мікалай Мікіціч**

Нарадзіўся 13 снежня 1917 года ў вёсцы Чорнае Знаменскага раёна Арлоўскай вобласці.
У лістападзе 1943 года быў прызначаны камандзірам партызанскага атрада імя Варашылава, а з красавіка 1944 года – камісарам Ленінскай брыгады. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступені, ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга, медалямі.
Удастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за актыўны ўдзел у партызанскім руху на тэрыторыі Шчучынскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
</td><td></td></tr>
</table>

## БУБНОЎ Іван Рыгоравіч

Нарадзіўся 11 кастрычніка 1914 года. Кадравы ваенны, з першага дня Вялікай Айчыннай вайны ўключыўся ў актыўную барацьбу з агрэсарам. З лютага 1943 года партызан атрада «За Савецкую Беларусь», з кастрычніка 1943 – камісар атрада.

Пасля вызвалення Беларусі працаваў загадчыкам аддзела адукацыі Васілішкаўскага раёна.

За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі.



## ГІЧАН Антон Уладзіміравіч

Нарадзіўся 12 ліпеня 1929 года ў вёсцы Макаўляны на Беласточчыне.

З 1952 па 1972 год працаваў брыгадзірам, загадчыкам вытворчага ўчастка, а з 1972 да 1976 года – загадчыкам жывёлагадоўчай фермы калгаса "1 Мая" Шчучынскага раёна.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, бронзавым медалём ВДНГ СССР. Герой Сацыялістычнай Працы (1966).



## ГЛАЗКОЎ Ілля Міхайлавіч

Нарадзіўся 1 жніўня 1922 года ў горадзе Генічэск Херсонскай вобласці. У гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў шлях ад радавога байца да камісара партызанскага атрада Шчучынскага партызанскага злучэння.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Дружбы народаў, медалямі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР у галіне навукі і тэхнікі.

Удастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за актыўны ўдзел у партызанскім руху на тэрыторыі Шчучынскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



## ГУЗЕНЬ Станіслаў Юльянавіч

Нарадзіўся 18 красавіка 1954 года ў вёсцы Яселевічы Шчучынскага раёна.

З 1977 года працаваў на розных пасадах у гаспадарках, якія размяшчаліся на землях сучаснага філіяла «Жалудоцкі агракомплекс» ААТ «Агракамбінат» Скідзельскі». З 2012 года ўзначаліў філіял «Жалудоцкі агракомплекс».

За шматгадовую добрасумленную працу ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Гродзенскага аблвыканкама, Шчучынскага райвыканкама.

У 2011 годзе ўдастоены звання «Чалавек года Гродзеншчыны".



## **ДЗІКЕВІЧ Эдмунд Станіслававіч**

Нарадзіўся 5 лютага 1935 года ў вёсцы Старая Падражанка Шчучынскага раёна.

З 1980 па 1995 год займаў пасаду загадчыка аддзела адукацыі Шчучынскага раённага выканаўчага камітэта. Заслужаны работнік адукацыі БССР (1991).

У 2012 годзе ўдастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё горада Шчучына і раёна.



## **ЕРЭМІНОВІЧ Зінаіда Пятроўна**

Нарадзілася 10 мая 1950 года ў вёсцы Першамайская Шчучынскага раёна.

Усё жыццё прысвяціла справе выхавання і навучання падрастаючага пакалення.

Узнагароджана медалём «60 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гадоў» за актыўны ўдзел у арганізацыі працы школьнага гісторыка-краязнаўчага музея.



## **ЖОЛЬ Валяр'ян Лявонавіч**

Нарадзіўся 13 студзеня 1953 года ў вёсцы Шляхты Шчучынскага раёна

Прайшоў працоўны шлях ад рабочага да кіраўніка Шчучынскай МПМК-167.

У 2010 годзе Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь быў удастоены звання «Лепшы кіраўнік года».

У 2015 годзе ўдастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё горада Шчучына і раёна.



## **КЛІМАК Станіслаў Іосіфавіч**

Нарадзіўся 22 красавіка 1945 гада ў вёсцы Паплавы Шчучынскага раёна. Працаваў даяром на ферме «Буйвічы» у калгасе «1 Мая». 15 студзеня 1967 года загінуў падчас пажару на ферме, спрабуючы выратаваць жывёл з агню. Пасмяротна ўзнагароджаны медалём «За адвагу на пажары».



## КАЗЯК Вінцэнты Іванавіч

Нарадзіўся 8 жніўня 1943 года ў вёсцы Куляшы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці.

Амаль 18 гадоў узначальваў Шчучынскі раён: з 1982 года па 1990 год на пасадзе першага сакратара райкама КПБ, з 1995 года па 2001 год – на пасадзе старшыні раённага выканаўчага камітэта.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыны III ступені, медалямі.

Удастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына ў 2010 годзе.



## КОНАНАВА Марыя Іванаўна

Нарадзілася 23 сакавіка 1953 года ў вёсцы Танявічы Шчучынскага раёна. З 1985 года працуе ў Першамайскай участковай бальніцы на пасадзе ўрача-тэрапеўта, з 1986 па 2006 год – галоўнага ўрача, з 2006 года – загадчыцай.

За шматгадовую добрасумленную працу ўзнагароджана медалём «За працоўныя заслугі» , лістом-падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровымі граматамі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў і Шчучынскага райвыканкама.



## КАНСТАНЦІНАЎ Мікалай Агафоавіч

Нарадзіўся 20 снежня 1932 года ў вёсцы Янчыкава (???) Яльчыкскага раёна (Чувашыя).

Працоўную дзейнасць у Шчучынскім раёне пачаў з 1957 года. Былы галоўны аграном калгаса "1 Мая" і эксперыментальнай базы «Руткевічы». За дасягнутыя поспехі ў раслінаводстве ўзнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі ВДНГ.

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (1994).



## КУРЫЛОВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч

Нарадзіўся 19 студзеня 1952 года ў вёсцы Заполле Шчучынскага раёна. Скончыў Ражанкаўскую сярэднюю школу, Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут.

У 1980 годзе стаў намеснікам старшыні калгаса імя Леніна.

З 1984 па 1998 год узначальваў эксперыментальную базу «Руткевічы».З 1998 года – дырэктар Гродзенскага занальнага інстытута раслінаводства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (2010 год), кавалер ордэна «Знак Пашаны», кандыдат сельскагаспадарчых навук.



## ЛУНЕВІЧ Іван Рафаілавіч

Нарадзіўся 29 снежня 1936 года ў вёсцы Пілеўсі Шчучынскага раёна.
Былы загадчык хірургічнага аддзялення Шчучынскага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання. Кандыдат медыцынскіх навук.
У 2007 годзе ўдастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё горада Шчучына і раёна.



## МАЙСТРОВІЧ Анатоль Паўлавіч

Нарадзіўся 11 лістапада 1937 года ў вёсцы Загараны Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. У 1966 годзе скончыў Гродзенскі медыцынскі інстытут.
З 1972 па 2001 год узначальваў Шчучынскую цэнтральную раённую бальніцу.
Урач-тэрапеўт вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.
«Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь» (1997). Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».



## МАКАРЧЫКАЎ Фёдар Піліпавіч

Нарадзіўся 10 чэрвеня 1926 года ў Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці.
У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У складзе войскаў 2-га Беларускага фронту вызваляў Польшчу і Нямеччыну.
Быў цяжка паранены.
За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За Перамогу над Германіяй», медалём «Жукава», юбілейнымі медалямі.



## МЯДЗВЕДЗЕЎ Уладзімір Іванавіч

Нарадзіўся 12 лютага 1928 года.
З 1955 па 1989 год працаваў старшынёй калгаса імя Леніна Шчучынскага раёна.
Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, двума ордэнамі «Знак Пашаны», чатырма медалямі ВДНГ СССР, трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.
Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР (1985).



## **МІСЮК Казімір Пятровіч**

Нарадзіўся 1 кастрычніка 1929 года ў вёсцы Лагада Шчучынскага раёна.
Былы брыгадзір трактарна-паляводчай брыгады эксперыментальнай базы «Шчучын».
Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна.
Герой Сацыялістычнай Працы (1976).



## **МАШКО Іван Рыгоравіч**

Нарадзіўся ў 1935 годзе ў вёсцы Сыраежкі Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці.
З 1971 г. па 1982 год – першы сакратар Шчучынскага раённага камітэта КПБ.
Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.
Удастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына ў 2010 годзе.



## **НАЗАРАВА Ганна Піліпаўна**

Нарадзілася ў 1921 годзе ў мястэчку Шацк Мінскай вобласці.
Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны.
З 1952 па 1961 год узначальвала калгас «1 Мая» Жалудоцкага раёна.
Узнагароджана ордэнам Леніна.
Герой Сацыялістычнай Працы (1960).



## **ВОСІПАЎ** Анатоль Фядотавіч

Нарадзіўся 25 кастрычніка 1940 года ў вёсцы Ахтырка Колпнянскага (???) раёна Арлоўскай вобласці РСФСР.
З лютага 1965 года і да адыходу на заслужаны адпачынак працаваў ў даччыным прадпрыемстве «Шчучынская МПМК-166» ГОУП «Гродннааблсельбуд»: з 1965 па 1967 год – цесляром-муляром, з 1967 года – брыгадзірам брыгады муляроў.
За шматгадовую добрасумленную працу і дасягненне высокіх паказчыкаў у галіне будаўніцтва ўзнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай рэвалюцыі.



## АСОКІН Іван Паўлавіч

Нарадзіўся 8 жніўня 1910 года ў вёсцы Кражым(???) Вольскага раёна Саратаўскай вобласці.
Былы начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Шчучынскага райвыканкама.
За поспехі, дасягнутыя ў развіцці сельскай гаспадаркі, быў узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, трыма залатымі, двума сярэбранымі і чатырма бронзавымі медалямі ВДНГ СССР, двума Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.



## ПАНОЎ Генадзь Аляксеевіч

Нарадзіўся 21 верасня 1949 года ў горадзе Шчучыне.Скончыў Шчучынскую агульнаадукацыйную школу, Гродзенскае музычнае вучылішча.
У 1990 годзе ўзначаліў створаны ім ансамбль народнай песні «Медуніцы», які з 1996 года носіць ганаровае званне «народны».
Лаўрэат Другога Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці (1987 год). У 2008 годзе за творчыя дасягненні адзначаны лістом падзякі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.



## ПЯРВУШЫН Васіль Якаўлевіч

Нарадзіўся 20 мая 1923 года ў вёсцы Краснагорскія Крыушы Нікіфараўскага(???) раёна Тамбоўскай вобласці РСФСР.
13 ліпеня 1944-га на танку Т-34 першым уварваўся на вуліцы горада Шчучына.
Пасля вайны працаваў у Шчучыне рабочым ДЭУ №836, з 1951 па 1970 год служыў у раённым аддзеле міліцыі.
Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.



## ПАГАРЭЛАВА Галіна Іванаўна

Нарадзілася 25 сакавіка 1923 года ў Васільеўскім раёне Свярдлоўскай вобласці РСФСР.
На пасадзе медсястры прымала ўдзел у баявых дзеяннях на франтах Вялікай Айчыннай вайны.
За баявыя заслугі ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі. За поспехі ў працы ўзнагароджана Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалём «За працоўную доблесць», значкамі «Выдатнік санітарнай службы» і «Выдатнік аховы здароўя».



| | |
|---|---|
| **РУДЫ Вацлаў Адольфавіч**<br>Нарадзіўся 4 кастрычніка 1936 года ў вёсцы Калечыцы Шчучынскага раёна.<br>Працоўную дзейнасць пачаў цесляром СУ-50. З 1966 па 1994 год – брыгадзір ПМК-26.<br>Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.<br>Заслужаны будаўнік Беларусі (1972).<br>Герой Сацыялістычнай Працы (1977). |  |
| **СМІРНОЎ Альберт Львовіч**<br>Нарадзіўся 20 жніўня 1926 года ў вёсцы Дзярэчын Зэльвенскага раёна.<br>У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ваяваў у Кітаі і Паўночнай Карэі.<br>Пасля дэмабілізацыі з войска ў 1951 годзе працаваў у сістэме кааперацыі Казлоўшчынскага і Мастоўскага раёнаў, з 1962 па 1987 год займаў пасаду старшыні Шчучынскага райспажыўсаюза.<br>Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. |  |
| **УШКЕВІЧ Сяргей Іосіфавіч**<br>Нарадзіўся 24 мая 1956 года ў вёсцы Дубінка Гродзенскага раёна. З 1980 года працаваў у калгасе «Савецкая Беларусь» Шчучынскага раёна. У 1998-2001 гадах – першы намеснік, а з 2001 па 2012 год – старшыня Шчучынскага райвыканкама. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.<br>Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».<br>Удастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Шчучынскага раёна. |  |
| **УШКЕВІЧ Алег Іванавіч**<br>Нарадзіўся 29 сакавіка 1954 года ў вёсцы Пілоўня Шчучынскага раёна. У 1976 годзе скончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут. З 1978 года працуе ў ААТ «Гроднажылбуд». Прайшоў шлях ад майстра ўчастка да кіраўніка прадпрыемства.<br>«Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь» (2014).<br>Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». |  |

| | |
|---|---|
| **ХІЛЬМАНОВІЧ Іван Георгіевіч**<br>Нарадзіўся 5 мая 1938 года ў вёсцы Шынкоўцы Шчучынскага раёна.<br>Працаваў механікам Ражанкаўскай МТС, механікам аўтабазы, галоўным інжынерам саўгаса «Пратасаўшчына». З 1972 па 1996 год быў старшынёй калгаса «Шлях Леніна».<br>За дасягнутыя поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі ўзнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.<br>Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР (1986). |  |
| **ХРЫПТОВІЧ Лілія Мікалаеўна**<br>Нарадзілася 19 ліпеня 1950 года ў вёсцы Шынкоўцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці.<br>Педагог, кіраўнік Народнага музея баявой славы сярэдняй школы №1 горада Шчучына.<br>За вялікі ўклад у справу навучання і выхавання школьнікаў узнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства асветы БССР, Ганаровай граматай Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, прысуджана прэмія імя Н.К. Крупскай. |  |
| **ЧАРНУШЭВІЧ Мечыслаў Станіслававіч**<br>Нарадзіўся ў 1944 годзе ў вёсцы Намейкі Шчучынскага раёна.<br>З 1970 года працаваў на розных пасадах у сяльгасарганізацыях Шчучынскага раёна.<br>За дасягненне высокіх паказчыкаў у працы неаднаразова прызнаваўся лепшым па прафесіі сярод жывёлаводаў ў раённым спаборніцтве. |  |
| **ШОТА Альфрэд Тадэвушавіч**<br>Нарадзіўся 14 верасня 1930 года ў горадзе Гродна.<br>Былы начальнік МПМК №167 вытворчага ўпраўлення Гродааблсельбуд горада Шчучына.<br>Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Заслужаны будаўнік БССР (1989).<br>У 2007 годзе ўдастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё горада Шчучына і раёна. |  |

| | |
|---|---|
| **ШУПЕНЯ Сцяпан Пятровіч**<br>Нарадзіўся 10 лістапада 1896 года ў вёсцы Нача Барысаўскага павета Мінскай губерні.<br>Былы сакратар Шчучынскага РК КПБ, камандзір Шчучынскага партызанскага аб'яднання.<br>Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, ордэнам Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава II ступені, медалямі.<br>Удастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за актыўны ўдзел у партызанскім руху на тэрыторыі Шчучынскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. |  |
| **ЮР'ЕЎ Мікалай Мікалаевіч**<br>Нарадзіўся 15 сакавіка 1923 года ў горадзе Мелітопаль Запарожскай вобласці (Украіна).<br>У жніўні 1941 года пайшоў добраахвотнікам на фронт. Служыў у агульнавайсковай разведцы. Прымаў удзел у вызваленні Шчучына.<br>За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі. |  |